УДК 82-1/9

Студ. К.А. Горбач
Нав. кір. канд. філал. навук, дацэнт кафедры Д.П. Зылевіч
(кафедра рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій, БДТУ)

# АГЛЯД СУЧАСНЫХ ЛІТАРАТУРНЫХ АНЛАЙН-ПРАЕКТАЎ У БЕЛАРУСІ

Сучасная кнігавыдавецкая сістэма ў Беларусі характарызуецца дынамічнымі тэндэнцыямі развіцця новых літаратурных працэсаў: пашырэнне літаратурнага асяроддзя ў сеткавай прасторы і ўзаемадзеянне традыцыйнага кнігавыдання і інтэрнэт-тэхналогій. На базе актыўнага эксперыментавання з формай і зместам твораў, а таксама выкарыстання новых інструментаў для прасоўвання выдання, з'явілася паняцце літаратурны анлайн-праект.

У дадзенай працы будуць разгледжаны асобныя беларускія анлайн-праекты з 2014 года па сённяшні час. Пад літаратурным анлайн-праектам будзем разумець інтэрнэт-рэсурсы з пэўнай канцэпцыяй і дызайнам, якія адрозніваюцца тэматыкай і мэтамі праекта ў залежнасці ад тэкставага і мультымедыя кантэнта.

Мэта даследавання – ахарактарызаваць асноўныя місіі такіх праектаў, задачы, якія яны вырашаюць з дапамогай літаратуры.

У літаратурнай інтэрнэт-прасторы сучаснай Беларусі існуе дастатковая колькасць праектаў. Практыка, якая напрацавана на сённяшні дзень у рэалізацыі літаратурных анлайн-праектаў, патрабуе тэарэтычнага асэнсавання і абагульнення. Пры гэтым нават агульнапрынятага азначэння тэрміна “анлайн-праект” на сённяшні дзень не існуе. Напрацоўкі ў гэтым кірунку зроблены такімі даследчыкамі, як І. Шайтанаў, Ю. Мальцава, А. Кузняцова, Г. Цаплакоў, Я. Бендэрскі.

Назавём найбольш цікавыя, на нашу думку, літаратурныя анлайн-праекты ў Беларусі.

1) “Мова Нанова” (2014 – па сённяшні час). Праект бясплатны для карыстальнікаў. Яго місія – даць магчымасць вывучаць беларускую мову цікава. Лексіка і граматыка прапануюцца ў інтэрактыўных формах. Пляцоўка мае сваю медыятэку — збор відэа, аўдыё і тэкставых матэрыялаў на беларускай мове.

2) SAY.BY (2016 – па сённяшні час). На платформе можна прачытаць, што гэта – “сайт, а таксама мабільны дадатак, на якіх сэрвіс дазваляе карыстальнікам не толькі адшукаць беларускамоўныя месцы побач, але і атрымаць “зніжку за мову” на розныя тавары і паслугі”. Сайт быў створаны дзеля таго, каб паведаміць зацікаўленым

людзям пра беларускамоўныя ўстановы і прасоўваць жывую беларускую гутарку ва ўсе сферы дзейнасці, асабліва бізнес.

3) MOVABOX (2016–2017). Аўтары праекта пішуць пра свае задачы: “распрацаваць маштабны інтэграваны праект, накіраваны на падтрымку беларускай літаратуры і культуры. Дзейнасць у гэтым напрамку з'яўляецца важнай часткай карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці кампаніі velcom”. Гэта праект ад кампаніі А1, які дапамог чытачам пазнаёміцца з сучаснымі беларускімі аўтарамі і іх творамі. Аўтары-ўдзельнікі праекта прэзентавалі свае творы, былі праведзены анлайн і афлайн мерапрыемствы для таго, каб чытач змог лепш зразумець сучасную беларускую літаратуру.

4) Караткевіч 90 (2020). Гэта інфармацыйная кампанія ад А1 і Onliner, прысвечана беларускаму пісьменніку з мэтай распавесці пра яго жыццёвы і творчы шлях чытачам, паказаць, наколькі сучаснымі і цікавымі з’яўляюцца яго творы. Кампанія ўключала шэраг анлайн-праектаў, у тым ліку трансляцыю спектакля “Наш Караткевіч” у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі, запіс падкаста з казкамі пісьменніка, якія агучылі вядомыя артысты Беларусі, серыю мультымедыйных артыкулаў пра жыццё У. Караткевіча, стварэнне Instagram-акаўнта пісьменніка.

5) “(Не)расстраляныя” (2017-2020). Праект партала TuzinFM прысвечаны памяці рэпрэсаваных у 1930-х беларускіх творцаў. Яго місія – вярнуць імёны і творы рэпрэсаваных дзеячаў беларускай культуры ў сучасны дыскурс. Ён уключае ў сябе стварэнне CD-дыска з песнямі на вершы паэтаў, лекцыі пра розных аўтараў, стварэнне старонак творцаў ў Facebook, куды дадаюцца іх творы, фота і ўспаміны.

6) “Беларуская і сусветная культура: глядзець, слухаць, чытаць” (wir.by) (2020-2021). Культурна-асветніцкі праект з лекцыямі навукоўцаў і даследчыкаў у відэа і падкастах, артыкуламі, гульнямі і спецпраектамі пра гісторыю, лінгвістыку, літаратуру, мастацтва і міфалогію.

7) “Сугучча” (2018-2021). Праект выдавецкага дома “Звязда”, накіраваны на зближэнне літаратурных і культурных адносін краін СНД, папулярызацыю сучаснай і класічнай літаратуры і культуры. На сайце sozvuchie.by можна знайсці матэрыялы пра класікаў беларускай і сусветных літаратур, прачытаць па-беларуску многія творы замежных пісьменнікаў і паэтаў.

8) Віртуальныя праекты Нацыянальнай бібліятэкі. Інфарматыўныя артыкулы з мультымедыя кантэнтам, якія дазваляюць даведацца пра культурную спадчыну Беларусі. У многіх праектах

можна азнаёміцца з архіўнымі дакументамі і аблічбаванымі старажытнымі кнігамі.

9) “Будзьма Беларусамі!”. Вялікую колькасць анлайн-праектаў робіць кампанія “Будзьма Беларусамі!”. Напрыклад, “Чорна-белыя вершы”, дзе паэты чытаюць свае вершы; фестываль рэкламы “aDNaK!”; прафесійныя буктрэйлеры; анімацыйныя адукацыйныя фільмы пра мову і літаратуру; беларускамоўныя налепкі для вайбера і тэлеграма; камунікацыйныя кампаніі «Будзьма!» і іншыя.

Такім чынам, можна сказаць, што літаратурныя анлайн-праекты ствараюцца з мэтай прапагандавання чытання, пашырэння ведаў аб сваёй культуры, гісторыі, распаўсюджвання ўжывання беларускай мовы. Такія праекты маюць розны змест, выкарыстоўваюць розныя метады рэалізацыі, маюць розны маштаб.

Сярод іх ёсць тыя, што ініцыіраваныя буйнымі кампаніямі (А1, Onliner) і дзяржаўнымі ўстановамі (выдавецкі дом “Звязда”). Варта адзначыць рост індывідуальных ініцыятыў сярод насельніцтва Беларусі. Сталі з'яўляцца падкасты, відэаканалы, блогі пра беларускую літаратуру і мову.

Напрыклад, тэлеграм-канал “Беларуская мова для лянівых”, аўдыёпадкаст Bellit, інстаграм-блог пра літаратуру Bookvajed, сацыяльны праект па абмену кнігамі “Мне не жалко” з кніжным клубам і іншыя. У сацыяльных сетках чытачы арганізоўваюцца ў літаратурныя клубы, кніжныя блогеры робяць агляды новых твораў.

Людзі нацыянальна-арыентаваныя, якія маюць патрэбу ў спасціжэнні і захаванні сваёй культуры, літаратуры, гісторыі, могуць знайсці для сябе цікавыя праекты.

## ЛІТАРАТУРА


1. Шайтанаў І. А. Сучасны эрас, ці Здабыццё голасу. / І. А. Шайтанаў // Арыён. 2005, № 4. С. 54.
2. Мальцава Ю. В. Спроба дэфініцыі сучаснага “літаратурнага праекта” [Тэкст] / Ю. В. Мальцава // Веснік Варонежскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя Філалогія. Журналістыка. — 2016. — №3. — С. 64-66.
3. Кузняцова А. Тры погляды на рускую літаратуру з 2008 года / А. Кузняцова // Знамя. 2008. №3. С.171-179.
4. Цаплакоў Г. М. Талент і лепта праектнай літаратуры / Г. М. Цаплакоў // Знамя. 2008. № 5. С. 195-206.
5. Бендэрскі Я. М. Барыс Акунін — літаратурны праект ці спрытная містыфікацыя / Я. М. Бендэрскі [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://world.lib.ru/b/benderskij_j_m/yakov_be.shtml (дата доступу 15.04.21).